***Т. В. Несцяровіч***
*Навук. кір.* ***В. А. Ляшчынская,***
*д-р філал. навук, прафесар*

## САМАТЫЗМЫ ЯК СРОДАК УТВАРЭННЯ ЖЭСТАВЫХ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ

У фразеалогіі як асобным раздзеле мовазнаўства фразеалагізмы (ФА) разглядаюцца як пэўная сістэма суадносных і ўзаемазвязаных моўных адзінак. Нягледзячы на фармальную, сэнсавую, вобразную, функцыянальную разнастайнасць, паміж ФА выяўляюцца трывалыя сістэмныя сувязі, і самі гэтыя моўныя адзінкі паддаюцца сістэматызацыі, падзелу на групы, на аснове чаго праводзіцца семантычная, марфалагічная, сінтаксічная, стылістычная, этымалагічная, тэматычная і іншыя класіфікацыі ФА.

Адну з груп беларускіх ФА паводле вытокаў іх утварэння складаюць жэставыя ФА, ці тыя, што ўзніклі на аснове канцэптуалізацыі замацавання пэўных жэстаў (*жэст* паходзіць ад лац. *Gestus* – рух цела), некаторых дзеянняў або рухаў чалавечага цела ці яго часткі, якія з'яўляюцца культурным знакам, стэрэатыпам, эталонам, сімвалам.

Мова жэстаў багатая на спосабы выражэння чалавекам самых разнастайных эмоцый і пачуццяў (варожасці, прыязнасці, адабрэння ці наадварот). Асноўнымі “сродкамі” выражэння жэстаў і праз іх найменняў новых рэалій і новых паводле свайго ўтварэння адзінак беларускай мовы выступаюць часткі цела, ці саматызмы, якія набылі сімволіку, выступаюць кампанентамі ФА. З ліку такіх на аснове выдзялення саматычных кампанентаў-сімвалаў ФА намі выдзелена некалькі груп жэставых ФА, якія з’яўляюцца самымі колькаснымі і разнастайнымі паводле значэння, а кампаненты-саматызмы самымі фразеўтваральнымі: а) рухі галавы і яе часткі (*адварочваць нос; адкрываць рот; адчыняць ілбом дзверы; аж нос гнецца; апускаць вушы; высалапіўшы язык; выскаляць зубы* і інш.); б) рухі рук (*апускаць рукі; атрэпваць рукі; высмоктваць з пальца; гладзіць па галоўцы; грэць рукі; палец аб палец не ўдарыць* і інш.); в) рухі ног (*біць ногі; браць ногі за пояс; зваліцца з ног; даваць падножку; на сваіх двух; на дыбачках* і інш.); г) рухі цела (*гнуць <сваю> спіну; ляжаць на баку; паварочваць тварам; на чужым гарбу ў рай ехаць* і інш.).

Жэставыя ФА маюць звязаную форму. Гэта пары, у якіх адзін кампанент – орган, які жэстыкулюе, а другі кампанент – цела другога чалавека ці прадмет.

Усе ФА адлюстроўваюць і выражаюць у спецыфічнай лаканічна-ацэначнай форме нацыянальныя стэрэатыпы паводзін чалавека, асаблівасці менталітэту беларусаў і культурныя ўстаноўкі эпохі, часу, у якія яны ўзніклі.

***Я. П. Сачанка***
*Навук. кір.* ***Л. В. Паплаўная,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## СПОСАБЫ МАРФАЛАГІЧНАГА ВЫРАЖЭННЯ ПАРАЎНАННЯЎ У РАМАНЕ І. ПТАШНІКАВА “МСЦІЖЫ”

Параўнанне – гэта адзін са сродкаў стварэння вобразнасці. Яно з’яўляецца адным са спосабаў характарыстыкі прадметаў і з’яў рэчаіснасці і, як стылістычны прыём, заснаваны на вобразнай трансфармацыі граматычна аформленага супастаўлення, шырока ўжываецца ў мастацкай літаратуры для больш яркага, выразнага і вобразнага выказвання.

У рамане І. Пташнікава “Мсціжы” параўнанні – адзін з самых ужывальных тропаў, і таму іх аналіз дазваляе выявіць адметнасць гэтага мастацкага прыёму ў сістэме

вобразных сродкаў пісьменніка і разам з тым даць уяўленне аб індывідуальнасці стылю мастака. Паводле спосабу марфалагічнага выражэння суб'екта параўнання ў мове рамана І. Пташнікава вылучаюцца субстантыўныя, ад'ектыўныя і вербальныя параўнанні.

Субстантыўныя параўнанні характарызуюць прадмет, паясняюць у сказе дзейнік, выражаны назоўнікам: …сівы ***туман*** падымаецца ў лагчыне за дарогай, ***што пара***… [1, с. 24]; …***сена*** – доўгая сухая мятліца, ***як салома*** [1, с. 28]; …цямнеў лес чорнымі шырокімі паласамі, адна пад адной, слалася ***смуга, як мокры дым*** [1, с. 4].

Ад'ектыўныя параўнанні вобразна характарызуюць прымету прадмета і маюць цесную сувязь з прыметнікам у сказе: І плот у гародзе быў ***чорны, як абгарэў*** [1, с. 11]; Ад агню зрабіўся ўвесь ***чырвоны, як бурак*** [1, с. 44]; Маталіся доўгія, заплеценыя самі сабой у косы, ***чорныя, як смоль***, і ***рудыя, як падпаленыя***, грывы… маталіся хвасты – …доўгія, павыцягваныя па валасіне, ***рэдкія, як жыта… зграбныя, як вытачаныя*** [1, с. 26].

Вербальныя параўнанні адносяцца да дзеяслова, які ў сказе выконвае ролю выказніка, вобразна характарызуюць працэс дзеяння: Прысадзістыя, рухавы і злосны, ён ***шнырыў, як памаўза***, між усімі [1, с. 28]; ***Свістаў*** у платах і старых лазовых вітках, ***як увосень у калючай мятліцы на аселіцы*** [1, с. 6].

Такім чынам, параўнанні ў рамане І. Пташнікава "Мсціжы" могуць адносіцца да розных членаў сказа. Найбольш пашыраны вербальныя і ад'ектыўныя параўнанні, якія граматычна афармляюцца пры дапамозе злучнікаў як, што, нібы.

**Літаратура**

1 Пташнікаў, І. Мсціжы / І. Пташнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1972. – 391 с.

***В. А. Сіліцкая*** *(МДУ імя А. А. Куляшова)*
*Навук. кір.* ***Я. Я. Іваноў,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## АФАРЫЗМЫ ПРА МОВУ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ

Адной з характэрных асаблівасцей беларускай літаратуры першай паловы XX стагоддзя з'яўляецца выкарыстанне афарызма як мастацкага сродка стварэння індывідуальна-аўтарскага вобраза свету. У афарызмах, як у люстэрку, адлюстраваны светаўспрыманне пісьменнікаў, іх аўтарская пазіцыя. Афарызмы беларускіх пісьменнікаў гэтага перыяду разнастайныя па тэматыцы, глыбокія ў сваіх суджэннях, трапныя і маляўнічыя, што абумоўлівае іх моцнае эмацыянальнае ўздзеянне на чытача.

Пачатак XX стагоддзя – гэта час станаўлення беларускай літаратуры і адначасова беларускай літаратурнай мовы, час рэвалюцыйных зрухаў, эпоха нацыянальнага адраджэння, калі вызначалася і ацэньвалася новае, пераацэньвалася – у кантэксце падзей – старое. Моўнае пытанне для беларусаў было ў той час адным з самых важных. Таму ў літаратурнай афарыстыцы першай паловы XX стагоддзя заўважнае месца займаюць трапныя выслоўі пра родную мову (усяго каля 10 % ад агульнай колькасці зафіксаваных у слоўніках [1; 2] афарызмаў).

Вось тры характэрныя для таго перыяду разуменні значэння роднай мовы ў лёсе нацыі, тры погляды на родную мову як сродак выяўлення духоўнага жыцця чалавека: *Мова – гэта душа нацыянальная народа, калі ёсць такая душа, то ёсць і гаспадар яе – гэта сам народ, а як не гіне народ з нацыянальнай душой, так не загіне беларускі народ!* (Ядвігін Ш.); *Мова – жывая істота. Яна жыве, а не існуе* (К. Чорны); *Дык шануй, Беларус, сваю мову – / Гэта скарб нам на вечныя годы; / За пашану радзімаму слову / Ушануюць нас брацця-народы!* (А. Гарун). Як бачым, кожны пісьменнік



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ